ДАРОГАМІ ПЕРАМОГІ

# У палях за Віслай соннай...

**Са зводкі Савінфармбюро за 17 студзеня 1945 года: «Войскі І Беларускага фронту здзейснілі імклівы абходны манеўр на захад ад Варшавы, занялі горад Жырадуў, перарэзалі дарогі на Сахачаў, фарсіравалі Віслу і 17 студзеня камбінаваным ударам з поўначы, захаду і поўдня авалодалі сталіцай саюзнай нам Польшчы горадам Варшава – важнейшым стратэгічным вузлом абароны немцаў на рацэ Вісла».**



Георгій Нікіфаравіч **АНДРЫЕВІЧ.**



Сяргей Антонавіч **РАДКЕВІЧ.**



Андрэй Мікалаевіч **СЯРЖАНІН.**



Іван Васільевіч **БАГДАШЫЧ.**



Аляксандр Дзмітрыевіч **ІСАКАЎ.**



Сцяпан Рыгоравіч **КАШКО.**



Павел Фёдаравіч **РУБЧЭНЯ.**



Мікалай Цімафеевіч **ЗАБРОДСКІ.**

Летам 1944 г. у выніку стратэгічнай наступальнай аперацыі «Баграціён» злучэнням Чырвонай Арміі ўдалося захапіць буйныя плацдармы на левым беразе Віслы – Сандамірскі, Магнушаўскі і Пулаўскі. Такім чынам быў зроблены добры задзел для будучай Вісла-Одэрскай аперацыі: у студзені 1945 г. адсюль пачнецца наступленне І Беларускага і І Украінскага франтоў, якое пракладзе дарогу ў самае логава трэцяга рэйха.

Чырвоная Армія завяршыла аперацыю «Баграціён» 29 жніўня 1944 г., але жорсткія і крывапралітныя баі з ворагам працягваліся за ўтрыманне і пашырэнне плацдармаў: немцы шалёна стараліся спіхнуць нашых вайскоўцаў у Віслу. Ішлі цяжкія баі і на подступах да Варшавы – 14 верасня 1944 г. было вызвалена ад фашыстаў прадмесце Варшавы – Прага, размешчанае на правым беразе Віслы. Аднак з ходу фарсіраваць шырокую раку і авалодаць горадам не ўдалося. У гэтых баях змагаліся плячо ў плячо савецкія і польскія воіны.

Трэба адзначыць, што ў складзе Войска Польскага было шмат беларусаў. Сярод іх ураджэнец в. Дарасіно старшы лейтэнант **Георгій Андрыевіч**, які за мужнасць і адвагу быў адзначаны як савецкімі, так і польскімі ўзнагародамі: медалямі Перамогі і Свабоды, «За Варшаву 1939-1945», «За Одру, Нісу і Балтыку», «Заслужаным на полі Славы» і Грунвальдскім знакам. Намеснікам начальніка аддзела аператыўнага кіравання штаба Войска Польскага ў гэты час служыў таксама наш зямляк, падпалкоўнік Якаў Гальчэня з в. Пласток.

У лістападзе 1944 г. наступленне Чырвонай Арміі было прыпынена, нашы войскі на гэтым участку фронту перайшлі да абароны. Яно і зразумела: трэба было зрабіць перадышку, папоўніць часці людзьмі і тэхнікай, падцягнуць тылы, якія вельмі адсталі за час імклівага наступлення Чырвонай Арміі, адладзіць належным чынам, як бы цяпер сказалі, лагістыку.

Івось у пачатку 1945 г. наступіў час канчаткова ачысціць Польшчу і яе сталіцу ад гітлераўцаў. У рамках стратэгічнай Вісла-Одэрскай наступальнай аперацыі савецкае камандаванне падрыхтавала Варшаўска-Познанскую аперацыю. Яе 14 студзеня распачалі войскі І Беларускага фронту, якім камандаваў маршал Георгій Жукаў.

У гэты дзень з мэтай акружэння групоўкі праціўніка на поўдзень ад польскай сталіцы ў наступленне перайшла 61-я армія. На наступны дзень, ахопліваючы Варшаву з поўначы, у бой рушыла 47-я армія, а 16 студзеня ў прарыў варожай абароны была ўведзена 2-я гвардзейская танкавая армія, якая кінулася праследаваць разгромленыя ў папярэдніх баях часці праціўніка.

Нямецкае камандаванне, спужаўшыся акружэння сваіх груповак у раёне Варшавы, пачало паспешна адводзіць іх у паўночна-заходнім накірунку. 17 студзеня 1945 г. войскі 47-й і 61-й армій сумесна з 1-й арміяй Войска Польскага вызвалілі сталіцу Польшчы. Варшава, адзін з найпрыгажэйшых гарадоў Еўропы, паўстала перад вызваліцелямі разрабаванай і разбуранай: палацы, бібліятэкі, універсітэт – усё было ператворана ў друз і пыл.

У выгнанні акупантаў з Варшавы і ў далейшым ачышчэнні тэрыторыі суседняй краіны ад гітлераўцаў прымала ўдзел шмат ураджэнцаў Любаншчыны.

Напрыклад, малодшы сяржант Аляксандр Лосік з Пластка быў разведчыкам узвода разведкі 215-га гв. стралковага палка 77-й гв. стралковай дывізіі, якая з восені 1944 г. утрымлівала Пулаўскі плацдарм. 14 студзеня 1945 г. першы батальён палка атрымаў загад наладзіць пры падтрымцы некалькіх танкаў і самаходак разведку боем варожых пазіцый на заходнім беразе Віслы. Раніцай пасля артпадрыхтоўкі хлопцы пайшлі ў атаку. Ды так рашуча і напорыста, што прарвалі чатыры паласы нямецкіх траншэй, першую – дык усяго праз сем хвілін, як замаўчалі нашы гарматы!

Кажуць, што ўсе радавыя, сяржанты і старшыны згаданага батальёна былі ўзнагароджаны ордэнам Славы, а камандзір батальёна Барыс Емельянаў і камандзір узвода Міхаіл Гур'еў сталі Героямі Савецкага Саюза. Праўда, даследчыкі сцвярджаюць, гэта толькі прыгожая легенда. Але Аляксандр Лосік свой ордэн Славы ІІІ ступені атрымаў менавіта за гэты бой: разам з саслужыўцамі ён першым уварваўся ў фашысцкі бліндаж і знішчыў да дзясятка гітлераўцаў. У прадстаўленні да ўзнагароды камандзір палка адзначае, што ён «сваімі ўмелымі дзеяннямі і асабістай храбрасцю праклаў шлях наступаючаму падраздзяленню».

Цікавы факт: з 309-ці вядомых нам землякоў-кавалераў ордэна Славы 103 атрымалі вышэйшую салдацкую ўзнагароду ў баях пры вызваленні Польшчы, прычым пяць з іх узнагароджаны двума ордэнамі (ІІІ і ІІ ступеняў). Сярод іх – Мікалай Гіль з Талі, аднапалчане Павел Муравейка з Талі і Васіль Кійко з Обчына (абодва загінулі 29.01.1945 г.), **Сяргей Радкевіч** з Чабусаў, Антон Магілявец з Урэчча, **Андрэй Сяржанін** з Любані і многія іншыя.

**У нашым музеі захоўваюцца копіі дакументаў да ўзнагарод, якімі былі адзначаны ўраджэнцы Любаншчыны за час баёў пры вызваленні Польшчы. Яны сведчаць пра іх высокую стойкасць і самаадданасць, падкрэсліваюць веліч подзвігу, які здзейснілі ў барацьбе з ворагам на польскай зямлі.**

Напрыклад, **Іван Багдашыч** (Дарасіно), тэлефаніст узвода сувязі 1103-га стралковага палка, 16 студзеня пры фарсіраванні Віслы пад бесперапынным варожым абстрэлам своечасова забяспечваў сувязь паміж штабам батальёна і ротамі, чым спрыяў паспяховаму наступленню палка. У кастрычніку 1945 г. ён быў узнагароджаны польскім медалём Перамогі і Свабоды.

Аляксандр Валатоўскі (Смольгава), радыётэлеграфіст батарэі ўпраўлення 63-й гаўбічнай артбрыгады, пры прарыве варожай абароны каля г. Варка на працягу ўсяго бою знаходзячыся ў перадавых парадках наступаючай пяхоты, адкуль вёў карэкціроўку артагню батарэі. Камандзір батарэі прадставіў яго да ўзнагароджання ордэнам Чырвонай Зоркі. Ордэнам Чырвонай зоркі пры фарсіраванні Віслы быў адзначаны і **Аляксандр Ісакаў** (в. Обчын), радавы 415-га стралковага палка.

Для ўзнагароджання непасрэдных удзельнікаў гераічнага штурму і вызвалення Варшавы Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 9 чэрвеня 1945 г. быў зацверджаны медаль «За вызваленне Варшавы». Па стане на 01.01.1995 г. ім адзначана прыблізна 701 700 чалавек. Сярод іх і нашы землякі.

Далёка не ўсім ураджэнцам Любаншчыны – байцам Чырвонай Арміі – пашанцавала ацалець у ходзе выгнання захопнікаў з Варшавы і іншых населеных пунктаў Польшчы. Сямён Абчынец (Любань), які пры фарсіраванні Віслы адным з першых дабраўся да левага берага ракі і падавіў агнявую кропку праціўніка, быў забіты 16 студзеня асколкам варожага снарада. **Сцяпан Кашко** (Таль), які ў 21 год быў прызваны ў дзеючую армію, за кароткі час стаў кавалерам ордэна Славы ІІІ і ІІ ступеняў, загінуў 15 сакавіка 1945 г. пад Штаргардам. 6 лютага загінуў у Памераніі Антон Цішкевіч (Рэдкавічы), а 17 лютага ў баі быў паранены і памёр ад ран у шпіталі **Павел Рубчэня** (Зялёнкі). У сакавіку ў баях на тэрыторыі Гданьскага ваяводства загінуў Сцяпан Кругленя (Азярное), у Шчэцінскім ваяводстве загінуў Віктар Дайнека (Загалле), а 1 красавіка памёр ад ран **Мікалай Забродскі** (Ракавішчы). 8 лютага пры выкананні баявога задання трапіў у палон і быў па-зверску закатаваны ворагам Захар Лышчэня (Пласток), якому пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Усіх не пералічыць. У аўтаматызаваным банку дадзеных ураджэнцаў Любаншчыны, якія загінулі і пахаваны на тэрыторыі Польшчы ў 1944 -1945 гг., значыцца 513 прозвішчаў. А колькі прапала без вестак...

* * *

На жаль, улады Польшчы сёння вядуць вайну з мёртвымі. Адзін за адным у польскіх гарадах знікаюць помнікі і абеліскі ў гонар савецкіх салдат – «у жывых» засталося каля сотні манументаў, у той час як у 1997 г. іх было 561. Так Польшча знішчае памяць пра сябе саму – лічаць тыя жыхары краіны, якія не падтрымліваюць афіцыйную пазіцыю і захоўваюць воінскія пахаванні, як польскія, так і савецкія.

**Сяргей КВІТКЕВІЧ, навуковы супрацоўнік Любанскага музея народнай славы.**